# IV Нядзеля Вялікага посту

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
27.03.2022 00:00




Лк 15, 1–3. 11–32 Набліжаліся да Езуса ўсе мытнікі і грэшнікі, каб паслухаць Яго. А фарысеі і кніжнікі наракалі, кажучы: “Ён прымае грэшнікаў і есць з імі”. Але Езус расказаў фарысеям і кніжнікам наступную прыпавесць, кажучы: “У аднаго чалавека было два сыны. Малодшы з іх сказаў бацьку: «Ойча, дай належную мне частку маёмасці». І той падзяліў паміж імі маёмасць. Праз некалькі дзён малодшы сын забраў усё і ад’ехаў у далёкі край, і там растраціў сваю маёмасць, жывучы распусна. А калі ён аддаў усё, настаў вялікі голад у тым краі, і ён апынуўся ў нястачы. Тады пайшоў і наняўся да аднаго жыхара гэтага краю, а той паслаў яго на свае палі пасвіць свіней. Ён жадаў напоўніць жывот свой стручкамі, што елі свінні, але ніхто не даваў іх яму. Апамятаўшыся, ён сказаў: «Колькі наймітаў у бацькі майго маюць удосталь хлеба, а я гіну тут з голаду. Устану і пайду да бацькі майго, і скажу яму: Ойча, я зграшыў супраць неба і перад табою. Я ўжо не варты называцца тваім сынам. Прымі мяне як аднаго з наймітаў тваіх». І ён ўстаў, і пайшоў да свайго бацькі. А калі быў яшчэ далёка, убачыў яго бацька ягоны і зжаліўся. І, пабегшы, кінуўся яму на шыю, і пацалаваў яго. А сын сказаў яму: «Ойча, зграшыў я супраць неба і перад табою. Я ўжо не варты называцца тваім сынам». Бацька ж сказаў слугам сваім: «Прынясіце хутчэй найлепшую вопратку і апраніце яго, і дайце пярсцёнак на руку яго і сандалі на ногі. Прывядзіце адкормленае цяля і зарэжце. Будзем есці і весяліцца, бо гэты сын мой быў памерлы і ажыў, прапаў і знайшоўся». І пачалі весяліцца. [...]

## Раскрытыя абдымкі

Бог праявіў міласэрнасць да грэшных людзей да такой ступені, што ў сваім Сыне, так глыбока, як гэта толькі магчыма, увайшоў у рэальнасць граху, нават атаясамліваючы сябе з грэшнікамі. Кожны, хто, як блудны сын, вырашае вярнуцца да Айца, заўсёды можа разлічваць на Яго міласэрнасць, на Яго раскрытыя абдымкі. Навярнуцца ніколі не позна, і ніякі грэх не з’яўляецца настолькі вялікім, каб рабіць немагчымым Божае прабачэнне. Грэшнік, які раскаяўся, атрымлівае дар новага пачатку, дзякуючы якому шлях, што ён прайшоў, вядзе да ўдзячнасці і праслаўлення Бога.

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
27.03.2022 00:00

***Пане Езу Хрысце, дапамажы мне заўсёды ўставаць і вяртацца да Цябе!***